2001. – С. 18 –21.

6. *Конституция* Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями 1996 г.) // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 1999. – № 1 (1/0).

7. *О единой* политике в области обязательного экземпляра документов: Постановление Межпарламентской ассамблеи государств-участников Содружества Независимых Государств о рекомендательном законодательном акте // Информационный бюллетень РБА. – 1995. – № 2. – С. 65 – 79.

8. *О сотрудничестве* в области культуры: Соглашение-Совет глав правительств СНГ от 15.05.1992 г. // Содружество: Информ. вестник Совета глав государств и Совета глав правительств СНГ. – 1992. – №5(5).

9. *Российским* библиотекам – прочную законодательную базу: Ответы председателя Государственной думы Федерального собрания Российской Федерации Г.Н.Селезнева на вопросы редакции журнала "Библиотековедение" // Библиотековедение. – 2002. – № 2. – С. 19.

10. *Соглашение* о ввозе материалов образовательного, научного и культурного характера ("Флорентийское соглашение") // Библиотека и закон: Юридический журнал-справочник / Ред.-сост. О.Р.Бородин, Л.В.Фирсова. – М.: Изд-во "Либерея-Бибинформ", 1999. – Вып. 7 (2'99). – С. 157 – 164.

11. *Соловьев В.Н.* Что такое модельный библиотечный кодекс? // Библиотека и закон. – 1996. – Вып. 1. – С. 117 – 118.

12. *Фирсов В.Р.* Государственное законодательное регулирование деятельности библиотек / Российская национальная библиотека; Ред. М.А.Логинова. – СПб., 2000. – 256 с.

13. *Шадурский В.* Внешняя культурная политика Республики Беларусь: состояние и проблемы // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2000. – № 4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*А.І.Мехавіч*

## ДА ПЫТАННЯ АБ ПРАФЕСІЙНЫХ ЯКАСЦЯХ КІРАЎНІКА КАЛЕКТЫВУ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Стварэнне калектыву як педагагічнай сістэмы абумоўлена вялікай колькасцю аб’ектыўных і суб’ектыўных фактараў. Сярод іх цэнтральнае месца займае асоба кіраўніка. Ад яго ўмення выкарыстоўваць складаны комплекс прафесійна-педагагічных ведаў, уменняў, навыкаў у многім залежыць арганізацыя педагагічнага працэсу.

Вельмі важнае значэнне мае псіхолага-педагагічная падрыхтоўка кіраўніка, асабліва на стадыі стварэння калектыву, яго арганізацыйнага ўмацавання, таму што, каб аб’яднаць музыкантаў, трэба валодаць сілай унушэння, мэтанакіраванасцю, бясспрэчным аўтарытэтам. Педагагічны і творчы працэсы ў калектыве абапіраюцца на мастацка-выканальніцкае і метадычнае майстэрства кіраўніка. Падрыхтоўка кіраўніка не заканчваецца сценамі навучальнай установы, ён павінен пашыраць культурны і эстэтычны кругагляд, удасканальваць свой стыль, узбагачаць прафесійныя веды. Педагагічная дзейнасць кіраўніка калектыву звязана з рэалізацыяй выхаваўчага, вучэбна-творчага і канцэртнага напрамкаў работы.

Разгледзім асноўныя складаючыя педагагічнага майстэрства кіраўніка калектыву:

– усведамленне важнасці і неабходнасці спецыяльнай арганізацыі педагагічнага працэсу і пастаяннага авалодання новымі ведамі і навыкамі;

– ажыццяўленне выхаваўчай работы, кантраляванне і кіраванне ёю;

– пабудова педагагічнага працэсу ў адпаведнасці з вызначанай загадзя перспектыўнай мэтай;

– раскрыццё і развіццё духоўных інтарэсаў і магчымасцей кожнага ўдзельніка.

Кіраўнік павінен умець аналізаваць сваю дзейнасць так, каб даць магчымасць удзельнікам праявіць сябе, не прыгнятаць іх сваімі ведамі і вопытам, умець выслухаць, быць дружалюбным, умець пераконваць, заахвочваць. Яго педагагічны такт накіраваны на забеспячэнне ўдзельнікаў максімальна спрыяльнымі ўмовамі для творчасці, раскрыцця і задавальнення духоўна-эстэтычных запатрабаванняў.

Мастацкія якасці кіраўніка ў агульным выглядзе можна падаць як сукупнасць яго ведаў па гісторыі і тэорыі мастац-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тва, эстэтыцы, мастацкіх здольнасцей і майстэрства ў адным з відаў мастацтва. Важнае месца маюць такія элементы мастацкага майстэрства, як уменне падбіраць рэпертуар для калектыву, аранжыраваць яго, весці рэпетыцыйную работу, самому выконваць творы, акампанаваць удзельнікам.

Педагагічныя якасці кіраўніка ўключаюць сукупнасць ведаў у сферы педагогікі, агульнай і ўзроставай псіхалогіі, яго педагагічныя здольнасці, уменні праграміраваць і планаваць педагагічны працэс у калектыве, ставіць і вырашаць педагагічныя задачы, накіроўваць калектыў на іх творчае вырашэнне.

Майстэрства ў любой прафесіі з’яўляецца своеасаблівым узорам, да якога трэба імкнуцца. Майстэрства вызначаецца як высокае мастацтва ў якой-небудь галіне, а майстар – спецыяліст, які дасягнуў высокага мастацтва ў сваёй справе. Асаблівасць прафесійнай дзейнасці кіраўніка заключаецца ў яе творчым характары і прафесійна-педагагічнай накіраванасці. Творчасць з’яўляецца абавязковай умовай эфектыўнасці, сродкам дасягнення жаданага выніку і складае сутнасць зместу дзейнасці кіраўніка. Майстэрства кіраўніка дасягаецца ў працэсе набыцця вопыту і патрабуе пастаяннага ўдасканалення ў розных відах дзейнасці і на розных этапах работы калектыву.

Рэпетыцыі належыць важная роля ў фарміраванні творчага калектыву, развіцці выканальніцкай, эстэтычнай і маральнай культуры ўдзельнікаў. Па рэпетыцыі можна меркаваць аб узроўні яго творчай дзейнасці, накіраванасці і характары выканальніцкіх прынцыпаў. Педагагічная эфектыўнасць рэпетыцый залежыць ад умела складзенага плана работы. Трэба абавязкова планаваць рэпетыцыйныя заняткі ў калектыве. Без гэтага з'яўляюцца стыхійнасць, мітусня, што ў канчатковым выніку адбіваецца на мастацка-эстэтычным росце калектыву, псіхалагічным настроі ўдзельнікаў на сур’ёзную творчасць.

Педагагічныя мэты з’яўляюцца ў такім выпадку звышзадачай. На яе забеспячэнне накіроўваюцца намаганні калектыву і кіраўніка, ёй падпарадкоўваюцца ўсе вучэбныя і рэпетыцыйныя заняткі. Звышзадача закладваецца як бы ўнутр дзейнасці калектыву. Кіраўнік папярэдне ставіць перад удзельнікамі канкрэтныя задачы: вывучыць тэкст, ноты, сло-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вы і інш. Увядзенне ў гэтую работу спецыяльных элементаў, якія фарміруюць і развіваюць маральныя якасці асобы, садзейнічаюць вырашэнню педагагічных мэт, адносіцца да ліку найбольш складаных, бо яны патрабуюць асаблівага таленту, педагагічнага мыслення, бачання асобы, надання ўсёй дзейнасці выхаваўчай скіраванасці. У мэтах больш эфектыўнай выхаваўчай работы неабходны ўлік індывідуальных асаблівасцей кожнага ўдзельніка ў асобасным і псіхалагічным плане. Без прадуманай арганізацыі рэпетыцыі не можа быць ні сапраўднага ўзаемаразумення паміж кіраўніком і калектывам, ні рэалізацыі педагагічнай і мастацкай праграмы.

Канцэртнае выступленне – адказны момант у жыцці калектыву. Яно з'яўляецца паказчыкам усёй арганізацыйнай, выхаваўчай працы кіраўніка і саміх удзельнікаў. Па выступленні мяркуюць аб моцных і слабых баках іх дзейнасці, уменні сабрацца, творчым почырку, арыгінальнасці, тэхнічных і мастацкіх магчымасцях калектыву. Канцэртнае выступленне мае важнае педагагічнае значэнне, таму што гэта не толькі мастацкая з'ява, колькі педагагічны сродак, у аснове якога ляжыць асобае спалучэнне арганізацыйна-метадычных, выканальніцкіх і маральна-эстэтычных фактараў. Канцэртнае хваляванне, што адчуваюць выканаўцы, адбіваецца на эмацыянальна-псіхалагічным і фізіялагічным стане, актывізуе працэс згуртавання калектыву.

Рэзюміруючы сказанае, адзначым, што прафесійныя якасці кіраўніка калектыву мастацкай творчасці ўключаюць як творчыя здольнасці, так і спецыяльныя мастацкія веды, уменні і навыкі, якія праяўляюцца на розных этапах работы па стварэнні твораў сапраўднай эстэтычнай накіраванасці.

*А.Э.Міланіч*

## А.БЕНУА І "НОВЫ РУСКІ БАЛЕТ" ПАЧАТКУ XX ст.

Творчасць А.Бенуа займае асаблівае месца ў рускім мастацтве пачатку XX ст. Як мастак ён быў адным са

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ